Яноўскі, А.А. Трымацца гістарычнай праўды (да 125-годдзя з дня нараджэння рэктара БДУ У. І. Пічэты) / А.А. Яноўскі, А.Г. Зельскі // Российские и славянские исследования: Сб. науч. статей. Вып. 1 / Редкол.: О. А. Яновский (отв. ред.) и др. — Мн.: БГУ, 2004. — С. 7–24.

# ТРЫМАЦЦА ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ (ДА 125-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ РЭКТАРА БДУ У. І. ПІЧЭТЫ)

**Яноўскі А. А.,**
*кандыдат гістарычных навук, прафесар*

**Зельскі А. Г.,**
*кандыдат гістарычных навук*

«... Я ўпэўнены, што шырокія працоўныя масы рэспублікі дадуць універсітэту поўную падтрымку і тым самым дадуць магчымасць стварыць кадры адукаваных работнікаў, якія шмат карысці прынясуць справе аднаўлення нашага краю».

З прамовы У. І. Пічэты ў час урачыстага акта адкрыцця БДУ 30 кастрычніка 1921 г.

Гэтымі словамі Уладзімір Іванавіч адкрыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Разам з тым для самога рэктара пачынаўся новы, бадай самы значны, перыяд яго жыцця. Тады яшчэ не ўсведамлялася, што ўзначаліў універсітэт не выпадковы адміністратар, але чалавек з ужо сфарміраваўшымся навуковым і грамадзянскім светапоглядам, з вялікім навуковым набыткам. Талент яго быў сапраўды шматгранны — руплівы даследчык, выдатны педагог, гуманітарый-эрудыт і, самае галоўнае, бліскучы вучоны-гісторык.

На раскрыццё гэтага таленту, як і цалкам на лёс паўплывала некалькі істотных момантаў. Па-першае, гэта сямейнае асяроддзе і тая атмасфера, у якой выхоўваўся У. І. Пічэта. Праз усё сваё жыццё Уладзімір Іванавіч пранёс светлую памяць аб сваім бацьку Іване (Йоване) Хрыстафоравічы Пічэце, які меў вялікі маральны ўплыў на сына і карыстаўся ў яго безумоўным аўтарытэтам [33, с. 75].

Разам з тым, як пісаў сам Уладзімір Іванавіч, І. Х. Пічэта быў «человек больших способностей и большого умственного дарования, отличался суровостью своего характера... и деспотическими наклонностями». Характар яго змягчыўся толькі пад старасць. Сам Уладзімір Іванавіч лічыў, што ўсё лепшае ў сабе ён пераняў ад сваёй маці, Марыі Рыгораўны, якая «была полной противоположностью отцу» [31, с. 147].

Іван Хрыстафоравіч Пічэта, герцагавінец з Мостара, як адзін з найлепшых вучняў мясцовай школы, атрымаў магчымасць вучыцца ў Расіі. Ён атрымаў духоўную адукацыю і ў 1867 г. заняў пасаду выкладчыка Палтаўскай духоў-



най семінарыі. Прыроджаны педагог, ён усё сваё жыццё прысвяціў выкладчыцкай дзейнасці. У 1888 г. І. Х. Пічэта быў прызначаны рэктарам Віцебскай духоўнай семінарыі. Гэтая пасада патрабавала рукапакладання ў святары. І. Х. Пічэта быў узведзены ў сан протаіерэя. Так, адбылося знаёмства падлетка Уладзіміра Пічэты з Беларуссю, дзе ён правёў тады два гады. Існуе меркаванне, што менавіта ў Віцебску У. І. Пічэта ў дасканаласці авалодаў беларускай мовай і, калі ён стаў рэктарам БДУ, вучыць яе не было патрэбы [38, с. 57]. У 1890 г. бацька атрымаў новае прызначэнне — узначаліць Палтаўскую духоўную семінарыю. На гэтай пасадзе І. Х. Пічэта працаваў да выхаду на пенсію ў 1902 г.

Сёння можна толькі меркаваць аб сапраўдных адносінах бацькі і сына, бо як слушна заўважыў В. Г. Карасёў, успаміны сына ствараліся ў 1931—1932 гг., у самы крытычны момант жыцця У. І. Пічэты [31, с. 147]. Між тым безумоўна, што І. Х. Пічэта перадаў сыну ў спадчыну любоў да гісторыі і талент даследчыка. Больш за тое, ці не пад пэўным уплывам бацькі Уладзімір Іванавіч выявіў схільнасць да вывучэння гісторыі Беларусі, Украіны, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва

Уладзіміра Іванавіча? Цяжка адказаць на гэтае пытанне дакладна, але пэўная верагоднасць усё ж існуе.

Наступным этапам у жыцці Уладзіміра Іванавіча была вучоба на гісторыка-філалагічным факультэце Маскоўскага універсітэта. Сярод кагорты тагачасных выкладчыкаў (М. М. Багаслоўскі, П. Р. Вінаградаў, М. С. Карэлін і інш.) сам У. І. Пічэта вылучаў В. В. Ключэўскага, бліскучая асоба якога зрабіла найбольшы ўплыў на Пічэту-студэнта. В. В. Ключэўскі даў найлепшы водгук на кандыдацкую (сёння гэта дыпломная) працу У. І. Пічэты «Юрий Крижанич о Московском государстве». Зусім верагодна, што тэматыка навеяна настроямі яго бацькі, які працяглы час марыў вярнуцца на радзіму, каб займацца там асветніцкай дзейнасцю, але не змог зрабіць гэта, бо ў 1878 г. Герцагавіна была перададзена Аўстра-Венгрыі.

Далейшы жыццёвы шлях не прадугледжваў якіх-небудзь нечаканасцей — выкладанне ў правінцыйных гімназіях, інстытутах, у лепшым выпадку — ва універсітэце. Але ён, відавочна, ужо тады адчуваў, што здатны на нешта іншае, значна большае. Аднак, каб уладкавацца на добрай пасадзе ў сталіцах імперыі, патрэбны былі не толькі талент і здольнасці, але і пратэкцыя і жыццёвая ўдача. І хаця яго бацька не быў «пралетарыям», аднак, каб прарвацца, напрыклад, у Маскву, каб заняць пэўную пасаду ў цэнтральных універсітэтах, неабходна было выявіць асаблівы запал і стараннасць, якія б не падлягалі сумневу, браць удзел у распрацоўцы актуальных гістарычных праблем, праблем «на злобу дня» і, самае галоўнае, быць палітычна лаяльным. З апошнім у маладога гісторыка былі вялікія праблемы. Ці адыгрываў тут пэўную ролю яго характар («кроў герцагавінца»), ці яго палітычныя перакананні — можна толькі здагадвацца. Праблематычнай здаецца думка, што ўжо ў тыя гады, напачатку ХХ ст., У. І. Пічэта выявіўся як перакананы марксіст [38, с. 59—62].

Чытаючы радкі следчых спраў, трэба памятаць пра час і месца іх напісання, маральны і фізічны стан зняволенага прафесара, пра тыя лжывыя абвінавачванні, якія яму прад'явілі. Каб выратавацца, можна акрэсліць сабе і марксістам пачатку стагоддзя... Безумоўна, як адукаваны чалавек, У. І. Пічэта быў добра знаёмы з асноўнымі палажэннямі канцэпцый марксізма, цалкам верагодна, што некаторыя з іх ён творча выкарыстоўваў на выкладчыцкай



працы на Прачыстанскіх курсах, на Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсах, падчас чытання лекцый у Бранску, Сызрані, Арле, Варонежы і іншых гарадах. Але безапеляцыйна казаць аб яго ідэйна-палітычных марксісцкіх перакананнях ніяк не выпадае. Па-першае, трэба памятаць, што маладосці заўсёды ўласцівы і пэўная «левізна», і пэўная катэгарычнасць, бо гэта — нармальна. Па-другое, малады гісторык не мог не заўважыць таго становішча, у якім апынуліся «нярускія» народы на абсягах імперыі — «турмы народаў», пазбаўленыя ўсялякіх правоў на нацыянальна-культурную аўтаномію. На гэта ўплывалі, відавочна, і дзіцячыя ўспаміны — сустрэчы з ссыльнымі ўдзельнікамі паўстання 1863 г. у Польшчы, Беларусі і Літве. Безумоўна, што там былі не адны «палякі» [38, с. 57]. Светапогляд У. І. Пічэты па нацыянальным пытанні выявіўся ў свой час у імкненні чытаць курс па гісторыі Украіны, у перакананні, што яна мае правы на нацыянальна-культурнае самавызначэнне [37, с. 26]. Здаецца, што менавіта гэта, а не дастаткова абстрактны марксізм, паслужыла падмуркам для асноўнага ідэйнага разыходжання паміж У. І. Пічэтам і прадстаўнікамі тагачаснай гістарычнай навукі. (Як і афіцыйнымі ўладамі). Апошняе выявілася ў рэакцыі Уладзіміра Іванавіча на забарону ўладамі ўрачыстасцей і лекцый, прысвечаных памяці Т. Р. Шаўчэнкі і А. І. Герцэна. (Наконт храналогіі гэтых падзей маюцца пэўныя разыходжанні) [30. с. 8; 38, с. 61]. У гэтым жа святле можна разгледзець і дзеянні У. І. Пічэты ў 1911 г., калі ён у знак пратэсту пакінуў разам з групай іншых прафесараў і прыват-дацэнтаў Маскоўскі універсітэт.

Немагчыма не заўважыць, што навуковы шлях У. І. Пічэты, яго творчы пошук з самага пачатку быў акрэслены праблематыкай гісторыі славянскіх народаў. У гады, якія папярэднічалі рэвалюцыі 1917 г., У. І. Пічэта плённа працаваў адразу на некалькіх навуковых напрамках. Падаецца верагодным, што малады гісторык толькі намацоўваў тое гістарычнае радовішча, якое будзе пасля распрацоўваць далей праз усё сваё жыццё. Гэта быў шэраг артыкулаў па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, сярод якіх вылучаюцца «Литовско-польские унии и отношение к ним литовско-русской шляхты», надрукаваныя ў зборніку, прысвечаным В. В. Ключэўскаму яго вучнямі і сябрамі (1909), і «Литовско-русское государство» (1910).

Па-другое, яго цікавіла праблематыка расійскай гісторыі, якую У. І. Пічэта вывучаў вельмі старанна. Тэматыка ягоных прац ахоплівае перыяд ад стварэння Маскоўскай дзяржавы і падзей Смутнага часу пачатку XVII ст. да адмены прыгоннага права і рэформаў 60—70-х гг. XIX ст. У 1909—1912 гг. У. І. Пічэта, як адзін з рэдактараў і аўтараў, удзельнічаў у падрыхтоўцы і выданні прац, якія вызначаліся пэўнай кан'юнктурай часу — 50-годдзем адмены прыгону, стогадовым юбілеем вайны 1812 г. і 300-годдзем дынастыі Раманавых. У такіх буйных шматтомных выданнях, як «Книга для чтения по истории нового времени» (1910—1914), «Великая реформа: Русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем» (1911), «Отечественная война и

русское общество. 1812—1912» (1911—1912), «Три века. Россия от смуты до нашего времени» (1912—1913), зборніках «Русская история в очерках и статьях» (1910), «Москва в ее прошлом и настоящем» (1912), «Крепостное право в Росии и реформа 19 февраля» (1911), «Отечественная война и ее причины и следствия» (1914) і інш., з’яўляецца вялікая колькасць яго артыкулаў, у якіх гісторык шмат увагі надае праблемам, звязаным са знешняй



палітыкай Маскоўскай дзяржавы, а пасля Расіі, рэформам Пятра І, сялянскаму пытанню і стаўленнем да яго ўрада і грамадства, гандлю, гаспадарцы і побыту Расіі XVII—XIX ст. і г. д.

І па-трэцяе, У. І. Пічэта правёў шэраг даследаванняў па гісторыі паўднёвых і заходніх славян. Іх небагата ў параўнанні з іншымі яго працамі — некалькі навуковых і папулярных артыкулаў, брашуры і рэцэнзіі: «Юрий Крижанич» (1914), «Исторический очерк славянства» (1914), «Драма болгарского народа: Борьба за национальное объединение Болгарии» (1915), «Исторические судьбы Сербии» (1915), «Сербия» (1917) і інш. Даследчыкі тлумачаць вяртанне У. І. Пічэты да гэтай тэмы падзеямі Балканскіх войнаў і Першай сусветнай вайны [34, с. 8; 40, с. 110—111].

Аднак вельмі істотным з’яўляецца тое, што нягледзячы на вялікія напрацоўкі ў сферы расійскай гісторыі, увесь дарэвалюцыйны час Уладзімір Іванавіч паслядоўна займаўся гісторыяй Вялікага княства Літоўскага. Вынікам гэтых вялікіх пошукаў і даследаванняў стала двухтомная манаграфія «Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве» (1917). Пасля абароны навуковых вынікаў гэтай працы ў 1918 г. аўтару была прысуджана вучоная ступень магістра, а праз месяц — доктара рускай гісторыі.

У. І. Пічэта ніколі не быў, што завецца, «прыбіты імперыяй». Нягледзячы на тое, што ён быў жыхаром Расіі толькі ў першым пакаленні, ён не імкнуўся зрабіцца большым расейцам, чым уласна расейцы. Нездарма ён меў мужнасць прамовіць падчас пампезных святкаванняў стогадовага юбілею вайны 1812 г. на ўрачыстым акце Практычнай Акадэміі навук, што расійская армія прайграла Барадзінскую бітву [37, с. 26]. Чаму ён так зрабіў? Таму што не любіў Расію? Хіба што не. Ёй У. І. Пічэта заўсёды аддаваў належнае як дзяржаве. А лічыць так яму дазволіла незашораны погляд, яго адыход ад звыклых стэрэатыпаў і галоўнае — прафесіяналізм гісторыка, які дазваляў лічыць тую армію, якая пакідае поле боя, пераможанай.

Пачуццё ўласнай годнасці — вось што трымала Уладзіміра Іванавіча на ўсіх пакручастых шляхах яго лёсу. «Трымацца гістарычнай праўды», — гэты выраз, бадай, мог бы стаць не толькі навуковым, але і жыццёвым дэвізам У. І. Пічэты. У пэўным сэнсе, яму шанцавала ў жыцці, нават у тыя часы, калі здавалася, што паратунку няма і ўжо не выбрацца з той прорвы, у якой зніклі бяследна тысячы і тысячы іншых асоб, нават больш вядомых і значных, чым ён.

Новую ўладу, якая ўсталявалася пасля рэвалюцыйнага перавароту ў кастрычніку 1917 г., У. І. Пічэта прыняў калі не адразу, то даволі хутка. Па сваёй натуры ён, безумоўна, не быў радыкалам, але як гісторык-прафесіянал выдатна ўсведамляў неабходнасць змены правячага рэжыму, які прывёў урэшце-рэшт да краху Расійскую імперыю. Усё папярэдняе жыццё ён сустракаў ад улад супрацьдзеянне сваім грамадскім ліберальна-дэмакратычным поглядам. Ранейшая ўлада ўпарта перакрывала яму шлях да універсітэцкіх вяршыняў, а ён не быў пазбаўлены славалюбства і, напэўна, мог па праву разлічваць на пэўную значную пасаду ў нанава ствараемай адукацыйнай сістэме. Па-сутнасці, так яно і адбылося. Іншая рэч, чаго гэта каштавала.

Мусіць, што менавіта тады, у 1918 г., У. І. Пічэта ўпершыню сутыкнуўся з набалелай праблемай стварэння універсітэта на Беларусі. Гэтае пытанне паслядоўна ўздымалася на працягу ўсяго 1917 г. мінскай гарадской думай і шэрагам іншых земскіх арганізацый перад Часовым урадам. Паралельна



гэтае ж пытанне ўзнялі і беларускія палітычныя і грамадскія арганізацыі, патрабуючы ад Часовага ўрада неадкладнага заснавання універсітэта. Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў Генеральны сакратарыят Вялікай Беларускай Рады (ВБР) звярнуўся з лістом да народнага камісара асветы А. Луначарскага, у якім прапанаваў пачаць найхутчэйшае адраджэнне Віленскага універсітэта. Пасля ж няўдачы, пытанне аб універсітэце зноў было ўзнята падчас працы Усебеларускага з’езда ў Менску 5—17 снежня 1917 г. На працягу 1918 г. Народны сакратарыят асветы БНР вёў працу па падрыхтоўцы адкрыцця універсітэту ў Менску. Аднак ажыццявіць гэтыя планы не ўдалося. Адмоўнае стаўленне да гэтага спачатку Часовага урада, а пасля цэнтральнага бальшавіцкага кіраўніцтва (у прыватнасці, наркамнаца І. Сталіна), палітычныя крызісы унутры кіраўніцтва БНР, адсутнасць фінансаў, інтэрвенцыя затрымлівалі адкрыццё універсітэта.

Неабходна падкрэсліць, што спробы стварыць універсітэт на Беларусі адбываліся і па другі бок лініі фронту. У 1918 г. Петраградскае аддзяленне Белнацкома ўзняла хадайніцтва ў Народным

камісарыяце асветы РСФСР аб замацаванні за Беларуссю Юр'еўскага універсітэта і пераводзе яго ў адзін з неакупаваных немцамі гарадоў Беларусі — у Віцебск або ў Смаленск. Акрамя таго, намаганнямі Белнацкома ў Маскве быў створаны Беларускі народны універсітэт.

Менавіта сюды быў запрошаны для выкладання гісторыі Беларусі У. І. Пічэта. Справа гэта была новая, амаль нязведаная на той час. Гэта было даручана У. І. Пічэце не выпадкова — з тых гісторыкаў, што лаяльна ставіліся да новага рэжыму, лепш за яго на той момант ніхто не ведаў гісторыі і эканомікі Беларусі. Дзякуючы сваім ранейшым працам, і грунтуючыся на вялікім досведзе педагагічнай працы, У. І. Пічэта ў сціслыя тэрміны стварыў курс лекцый з нязвыклай і сімвалічнай назвай — «История белорусского народа», які арганічна ўвайшоў у навуковы дапаможнік «Курс белорусоведения. Лекции, читанные в Белорусском народном университете в Москве летом 1918 г.» (1918—1920).

Акрамя таго, У. І. Пічэта выдае ў Вільні ў 1921 г. працу «История Литовского государства до Люблинской унии». Яна ўяўляе сабой перавыданне з невялікімі змяненнямі працы «Литовско-русское государство», надрукаванай у 1910 г. у зборніку «Русская история в очерках и статьях». Верагодна, што работа У. І. Пічэты ў Маскоўскай камісіі садзейнічання стварэнню Беларускага універсітэта ў Мінску, яго ўдзел у якасці эксперта па пытаннях архіваў і помнікаў культуры на савецка-польскіх перамовах у Рызе і савецка-літоўскіх у Маскве ў 1920—1921 гг., адчувальная актуальнасць «беларускага пытання» ў пачатку 1920-х гг., падштурхнулі У. І. Пічэту перавыдаць сваю ранейшую працу агульнага характару, якая, прынамсі, даводзіла, што Вялікае княства Літоўскае было па сваёй сутнасці не літоўскай (г. зн. жмудзінскай), але літоўска-рускай (г. зн. беларускай) дзяржавай. Можна меркаваць, што менавіта гэтыя працы леглі ў падмурак яго «Гісторыі Беларусі», створанай у 1924 г.

Відавочна ўсё падабенства яго біяграфіі з лёсамі інтэлігенцыі старой дарэвалюцыйнай Расіі, якая павінна была змірыцца з пачаўшымся пераўладкаваннем і прыстасоўвацца да яго. Ён быў ужо адбыўшымся даследчыкам, вядомым у гістарычных колах вучоным. І, вось, раптам ён, з маладзёвай запальчывасцю бярэцца за нязведаную справу — будаванне універсітэта і яго кіраў-



ніцтва ў амаль невядомай яму Беларусі. Ён пайшоў на творчыя нязгоды і штодзённыя нястачы, з'ехаўшы з наседжанай Масквы ў спустошаны вайной Менск, каб на пустым месцы збудаваць беларускую вышэйшую школу. І, нягледзячы на далейшы пакручасты лёс, жыццёвы шлях Уладзіміра Іванавіча нельга акрэсліць як аднастайны ці манатонны. Кім быў бы У. І. Пічэта, калі б не рызыкнуў памяняць рэальны Маскоўскі універсітэт на прывідную рэктарскую пасаду ў Менску. Вядома, ён быў бы знаным вучоным, даследчыкам, прафесарам, узыйшоў бы на акадэмічныя вяршыні, але ці зрабіўся б ён вядомым і аўтарытэтным настолькі, што з яго думкамі і словамі вымушаны былі лічыцца ў навуковых колах як СССР, так і замежжа. Цяжка адказаць пэўна. А шмат жа хто з запрошаных прафесараў не вытрымліваў складанасцей жыцця (як палітычных, так і чыста матэрыяльных) у сталіцы савецкай Беларусі і з'язджаў назад, у Маскву, да ўтульных кабінетаў і важкіх пайкоў. І хто памятае зараз пра іх, акрамя жменькі даследчыкаў?! Таму з поўным правам неабходна лічыць, што самы значны перыяд жыцця Уладзіміра Іванавіча Пічэты — гэта яго праца ў Менску на пасадзе рэктара Беларускага універсітэта. Гэта вышыня і яго навуковай кар'еры.

Яшчэ ў лютым 1919 г. наркамат асветы на пасяджэнні ў Менску прыняў рашэнне аб стварэнні спецыяльнай камісіі па арганізацыі Беларускага універсітэта, і ўся падрыхтоўчая работа стала праводзіцца членамі гэтай, мінскай, камісіі. Потым, з красавіка 1919 г., калі была створана яшчэ і маскоўская камісія, арганізацыйныя дзеянні пайшлі шпарчэй. Але «ўдарнага» кіраўнічага ядра не было, хаця абедзве камісіі вылучылі з сваіх радоў нейкае яго падабенства — так званыя «тройкі» і нават «пяцёркі» [32, с. 8—9, 12].

У кастрычніку 1920 г. па прапанове ўрада ССРБ маскоўскую камісію ўзначаліў У. І. Пічэта. 27 снежня ён наведаў Менск, дзе разам з членамі менскай камісіі паспрабаваў актывізаваць працу па стварэнні універсітэта.

Толькі ў пачатку 1921 г. менская і маскоўская камісіі па арганізацыі БДУ прыйшлі да высновы аб неабходнасці канцэнтрацыі паўнамоцтваў у руках невялікай колькасці найбольш энергічных і «прабіўных» сваіх членаў. Дзейнасць так званых «троек» не магла задаволіць, бо іх прадстаўнікі не мелі неабходных юрыдычных праў. Таму на пасяджэннях калегіі Наркамасветы РСФСР, якія рэгулярна сталі праходзіць з лютага 1921 г. у Маскве менавіта з мэтай абмеркавання пытанняў стварэння універсітэта на Беларусі, і было вырашана пераўтварыць маскоўскую «тройку» у часовае праўленне будучага БДУ. Рашэнне ад 7 сакавіка было падмацавана згодай з боку Галоўпрафасветы РСФСР.

Такім чынам, першае універсітэцкае кіраўніцтва натуральна «вырасла» са складу падрыхтоўчых камісій. Ужо 16 сакавіка 1921 г. Часовае Праўленне БДУ у складзе Уладзіміра Іванавіча Пічэты, Фёдара Фёдаравіча Турука і Захара Рыгоравіча Грынберга распачала сваю дзейнасць,

знаходзячыся ў Маскве [6, арк. 9, 15]. Асабліва дзейснай аказалася роля апошняга — З. Р. Грынберг ведаў фінансамі Наркамасветы РСФСР.

Першае ж не часовае, а «сапраўднае», паўнамоцнае Праўленне БДУ было зацверджана пастановай калегіі Наркамасветы ССРБ 8 ліпеня 1921 г. у складзе У. І. Пічэты (рэктар), У. М. Ігнатоўскага, Ф. Ф. Турука, М. Я. Фрумкінай. У жніўні гэтая ж калегія ўвяла ў склад універсітэцкага кіраўніцтва студэнтаў — Гіндзіна і яго намесніка (!) — Аблярэўскага [6, арк. 2, 3]. Праз год рэктар



адзначыў асаблівую ролю М. Я. Фрумкінай, якая мела ўплыў на чыноўніцкія колы Масквы, а таксама першага кіраўніка справамі БДУ І. І. Метліна.

Прысутнасць у складзе Праўлення студэнтаў падкрэслівала дэмакратычнасць універсітэцкага кіраўніцтва, што адпавядала духу часу. Але рэальнага ўдзелу ў справах арганізацыйных, акадэмічных і г. д., зразумела, студэнты не маглі прымаць, бо для іх першаснай задачай была вучоба. А вучыцца не кожны палітычна актыўны студэнт мог належным чынам. Таму ў Праўленні прадстаўнікі універсітэцкага студэнтства змяняліся вельмі часта.

Яшчэ адным праяўленнем дэмакратызму ў дзеяннях Праўлення было правядзенне публічных пасяджэнняў. Дарэчы, толькі за першы навучальны год адбылося 57 пасяджэнняў, на якіх былі прыняты 338 пастаноў па самых розных баках універсітэцкага жыцця [27, с. 7]. І не толькі універсітэцкага! Універсітэт з самага пачатку свайго існавання ставіў мэту стаць «центральным культурным очагом не только современной Белоруссии, но и соседних губерний, к ней примыкающих, Витебской, Гомельской, Смоленской», каб праз сваю дзейнасць «объединить смежные губернии» у адзінай дзяржаве [27, с. 6].

Акрамя Праўлення існаваў і Савет БДУ, члены якога абіраліся на агульным сходзе супрацоўнікаў [9, арк. 9; 8, арк. 51]. Разам з прафесарамі і выкладчыкамі ў яго склад абіраліся (а таксама і назначаліся) прадстаўнікі ЦВК, Наркамасветы, Белрабасветы, ВСНГБ, Мінгарвыканкома і іншых дзяржаўных арганізацый. Уваходзілі ў яго склад у абавязковым парадку і студэнты [8, арк. 9—16]. На факультэтах таксама абіраліся саветы. Але новы універсітэцкі статут, які быў уведзены пасля зацвярджэння ў кастрычніку 1921 г. Палажэння аб вышэйшых навучальных установах РСФСР, проціпаставіў саветам прадметныя камісіі, якія падпарадкоўваліся Праўленню БДУ і трымалі кіраўніцтва ўсім навучальным працэсам на факультэтах. Між тым факультэцкія саветы, у адрозненні ад Савета БДУ, аказаліся дастаткова жыццяздольнымі, і разам з дэканатамі вырашалі важнейшыя пытанні факультэцкага ўзроўню [36, с. 7—10].

У адпаведнасці з новым Палажэннем аб ВНУ на Савеце БДУ 17 студзеня 1922 г. было абрана і новае праўленне: У. І. Пічэта (рэктар), У. М. Іваноўскі, С. З. Кацэнбогін, намеснік загадчыка рабфака У. І. Корсак і студэнт-ваенком медфака С. І. Баркусевіч [9, арк.3; 27, с. 7].

Першыя факультэты ўзначалілі вядомыя на той час вучоныя. Гэтыя назначэнні былі прэрагатывай праўлення БДУ. Так, першым дэканам медфака рашэннем праўлення ад 31 кастрычніка 1921 г. быў зацверджаны прафесар Б. М. Беркенгейм, аднак ён фактычна не прыступіў да выканання сваіх абавязкаў, і часова факультэтам кіраваў біёлаг А. У. Федзюшын [7, арк. 3], якога ў хуткім часе змяніў прафесар-медык М. Б. Кроль. З ліпеня 1922 г. кароткі час дэканам медфака быў вядомы ў Расіі вучоны С. П. Сакалоўскі, які адначасова ўзначаліў кафедру агульнай хірургічнай паталогіі [8, арк. 25; 16, арк. 97].

Першым дэканам факультэта грамадскіх навук стаў нарком асветы ССРБ гісторык У. М. Ігнатоўскі (яго намеснікам быў малады беларускі філосаф С. Я. Вальфсон). Ігнатоўскі ж у канцы жніўня 1922 г. быў прызначаны кіраваць новым факультэтам — педагагічным (яго намеснікі — гісторык М. М. Нікольскі і матэматык І. С. Пятосін), рашэнне аб адкрыцці якога было прынята праўленнем БДУ 26 мая 1922 г. [11, арк. 24]. Пасля гэтага ФГН



узначаліў С. З. Кацэнбоген — прафесар-сацыёлаг. Такім чынам, першае кіраўніцтва факультэтаў было выключна з прафесараў.

Рашэнне аб вызначэнні 30 кастрычніка 1921 г. як даты адкрыцця універсітэта было прынята на пасяджэнні Савета факультэта грамадскіх навук (ФГН) 16 кастрычніка. Тады ж зацвердзілі першыя вучэбныя планы двух аддзяленняў гэтага факультэта (грамадска-эканамічнага і этнолага-лінгвістычнага), вырашылі пытанне аб памерах акладаў выкладчыкаў, намецілі да адкрыцця 9 вучэбных кабінетаў [13, арк. 1—3]. Але толькі 29 кастрычніка была завершана падрыхтоўка раскладу заняткаў і вызначана дата першай лекцыі — 31 кастрычніка, у панядзелак, у 13.30, у актавай зале былога вучылішча Хайкіна, што на рагу вуліц Магазіннай і Багадзельнай [13, арк. 6].

Так, званы Акт адкрыцця Беларускага дзяржаўнага універсітэта адбыўся апоўдні 30 кастрычніка 1921 г. (у той жа актавай зале вучылішча Хайкіна) з удзелам прафесараў, выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва. З дакладамі выступілі рэктар У. І. Пічэта, прафесары І. М. Салаўёў (яго тэма: «Школа і задачы навуковай педагогікі») і М. Б. Кроль (на тэму «Мышленне і мова»).

Такім чынам, толькі праз амаль 4 месяцы пасля ўрачыстага адкрыцця БДУ, якое прайшло 11 ліпеня ў будынку клуба імя Карла Маркса (Мінскі гарадскі тэатр) і больш паходзіла на ідэалагізаваную вечарыну, на якой і прафесары, і савецкія, і партыйныя лідэры шмат гаварылі аб тым, што пажадана, каб БДУ як мага хутчэй з’явіўся, але не аб рэальна распачатай дзейнасці універсітэта. Тым больш, што адначасова трэба было засведчыць гадавіну з дня вызвалення Мінска ад польскай акупацыі. Так што гэтая запалітызаваная акцыя толькі як бы падвяла рысу пад шматцяжкімі папярэднімі падрыхтоўчымі работамі па стварэнні асноў БДУ [29, с. 20]. А яны былі ў асноўным падрыхтаваны: ужо існавалі вучэбныя планы ФГН і медфака, набываліся кнігі для бібліятэкі, інтэнсіўна ішлі перамовы з магчымымі кандыдатамі на заняцце пасад прафесараў і выкладчыкаў, рамантаваліся атрыманыя «для нужд» БДУ будынкі, ішлі з 17 чэрвеня заняткі з 160 рабфакаўцамі [4, арк. 80].

У мітусні гэтых надзённых праблем і клопатаў вызначаўся і сэнс будучай дзейнасці універсітэта на самых заходніх межах перамогшага бальшавізму. На жаль, нацыянальная самабытнасць беларусаў, іх гісторыя, культура, дзяржаўнасць, якія павінны былі зрабіцца першапрычынай заснавання (больш дакладна, адраджэння) універсітэцкай адукацыі на беларускай зямлі, ціха адышлі на другі план. Больш канстатавалася тое, што заснаўванне універсітэта ў Мінску з’яўляецца вельмі неабходнай справай, паколькі будзе садзейнічаць усебаковаму вывучэнню «особенностей края и его сближению во всех областях с Россией», а таксама далучыць рабочае і сялянскае насельніцтва да універсітэцкай адукацыі і «тем будет содействовать поднятию уровня экономической культуры и производительности труда» [5, арк. 36].

Новы універсітэт зазнаваў нястачу ва ўсім: не было вучэбнай літаратуры, паперы, пісалі ў лепшым выпадку алоўкамі, аўдыторыі амаль зусім не ацяпляліся. Але галоўнай праблемай для першага рэктара было пытанне забеспячэння вучэбнага працэсу кваліфікаванымі выкладчыцкімі кадрамі. Да пачатку заняткаў на ўрадавым узроўні першымі прафесарамі універсітэта былі зацверджаны гісторыкі У. М. Ігнатоўскі, Д. П. Канчалоўскі, М. М. Нікольскі,



Д. А. Жарынаў, С. З. Кацэнбоген, Ф. Ф. Турук, А. А. Савіч, У. І. Пічэта, У. М. Перцаў, М. А. Янчук, філосафы У. М. Іваноўскі, С. Я. Вальфсон, фізік М. М. Андрэеў, заолаг А. У. Фядзюшын, медык М. Б. Кроль і інш. Характэрна, што сярод прафесараў быў зацверджаны і сакратар кампартыі Беларусі В. Г. Кнорын, які (ён скончыў яшчэ ў 1910 г. настаўніцкую семінарыю) пачаў чытаць лекцыі па палітэканоміі [41, с. 203—204; 1, арк. 72—73].

Нягледзячы на нястачы і цяжкасці, універсітэт разгортваў сваю працу. Гэта быў час вялікага рамантызму і вялікага энтузіязму, вялікага ўздыму і вялікіх спадзяванняў. Ішло сапраўднае стварэнне нечага новага. Тым болей, што кіраўніцтва Беларусі ў асобе старшыні ЦВК А. Р. Чарвякова ўсяляк апеквала ўласны універсітэт. Нездарма ўжо ў 1925 г. рэктар У. І. Пічэта, прыгадваючы першы, самы цяжкі год існавання БДУ, адзначыў, што «ў цяжкія хвіліны універсітэцкага жыцця мы ішлі да Аляксандра Рыгоравіча Чарвякова і знаходзілі ў яго дапамогу і падтрыманьне» [35, с. 18].

Гэта быў час, калі ўсё было першае: першая аўдыторыя і першая лекцыя, першыя факультэты — рабочы, грамадскіх навук, медыцынскі, педагагічны, першыя выпускі студэнтаў — юрыстаў і эканамістаў, першыя навуковыя часопісы («Шлях студэнцтва», «Працы БДУ», першыя універсітэцкія газеты («Голас рабфакаўца», «Голас студэнта»), першыя кафедры і першыя выкладчыкі, сярод якіх былі і вядомыя тады ўсім У. М. Ігнатоўскі, і Якуб Колас, і вядомыя толькі ў сваім асяродку М. Б. Кроль і У. М. Перцаў, першыя калекцыі, што выраслі ў музеі — заалагічны і мінералагічны, першы студэнцкі тэатр (І924), першыя замежныя кантакты (Лейпцыгскі універсітэт, 1923). Урэшце, быў закладзены першы камень у падмурак універсітэцкага гарадка... І за ўсім гэтым стаяў клопат першага рэктара — Уладзіміра Іванавіча Пічэты. Нават, не проста клопат, а сапраўднае імкненне, каб універсітэт меў уласнае аблічча, адметныя рысы, каб закладаліся пэўныя традыцыі.

Тут, здаецца, варта прыгадаць, што з непасрэдным удзелам рэктара адбываліся амаль усе мерапрыемствы ў маладым універсітэце. У «Описи дел Белгосуниверситета за период с 1921—1932 годы», якая знаходзіцца ў архіве БДУ, у спісе лекцыйных кніжак студэнтаў 1921 г. паступлення пазначана прозвішча Уладзіміра Міхайлавіча Каракулька [1, арк. 159]. Гэтаму студэнту воляй лёсу выпаў гонар стаць першым, хто абароніць дыпломную працу і тым самым атрымае права звацца першым дыпламаваным спецыялістам новай Беларусі. Як сведчыла невялічкая замалёўка ў газеце «Звезда», дыпломная работа Уладзіміра Каракулька была выканана на актуальную на той час

тэму — «Ножницы» (фабрично-заводская промышленность и сельскохозяйственный рынок СССР)». Апаніравалі яму на абароне рэктар У. І. Пічэта і прафесар І. Я. Герцык [2]. Гэтыя выкладчыкі з 1921 г. вялі заняткі на факультэце грамадскіх навук: гісторык У. І. Пічэта чытаў будучым эканамістам курсы гісторыі народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі, Ілья Якаўлевіч Герцык — палітычную эканомію, гісторыю сацыялізма, грашовы зварот, гісторыю эканамічных вывучэнняў, вёў семінары па банкаўскай справе і інш. [27, с. 19—21]. Абарона была публічнай: прысутнічала шмат людзей і, зразумела, усе тыя, хто рыхтаваўся сам абараняць сваю працу. Камісія, заслухаўшы ўсе «за» і «супраць», вырашыла выставіць «вполне удовлетворительную» адзнаку і выдаць У. М. Каракулька дыплом за нумарам 1.



Не абыходзіўся той час і без кур'ёзных выпадкаў. Першы адбыўся ў першы ж дзень заняткаў, якія былі прызначаны на 12 гадзін раніцы 31 кастрычніка. Гадзінам к 10-ці на факультэт прыйшоў намеснік дэкана С. Я. Вальфсон. Факультэт займаў адзін паверх у будынку колішняга рэальнага вучылішча Хайкіна на вул. Магазыннай (пасля Універсітэцкая, цяпер — Кірава. Сёння пыблізна на гэтым месцы будынак штаб-кватэры краін СНД). Акрамя факультэта там месцілася чыгуначная школа, адміністрацыя якой не жадала тады вызваляць будынак для БДУ.

У актавай зале С. Я. Вальфсон сустрэўся з рэктарам. Уладзімір Іванавіч Пічэта самотна блукаў па вялізным пакоі, у якім неўзабаве павінна было пачацца універсітэцкае жыццё. «Ведаеце, хутка ўжо пачнуць збірацца студэнты, а глядзіце што робіцца...», — звярнуўся рэктар да намесніка дэкана. У актавай зале цалкам адсутнічала мэбля. Як-жа быць? У прымыкаючым да зала калідорчыку было навалена некалькі дзесяткаў услонаў і табурэтак, прывезеных напярэдадні з Наркамату асветы. У будынку нікога не было — ні служачых, ні прыбіральшчыкаў. Уладзімір Іванавіч сказаў: «Тэба спяшацца. Давайце будзем самі наводзіць парадак». І тады рэктар разам з намеснікам дэкана факультэта ўзяліся пераносіць і размяшчаць услоны. Знайшлі невялікі столік і прыстасавалі яго як «кафедру». На дзвярах С. Я. Вальфсон прымацаваў ліст паперы з надпісам чырвона-сінім алоўкам : «Аўдыторыя № 1. Уваход у час лекцыі забараняецца». Хутка пачалі збірацца студэнты, а крыху пазней да адказу ў перапоўненай залы соценны натоўп прагна слухаў першую лекцыю ў гісторыі Універсітэта «Аб культуры Міжземнага мора ў эпоху панавання Рыму», якую чытаў прафесар Д. П. Канчалоўскі [28, с. 54]. Так пачыналася універсітэцкае жыццё...

Беларускі універсітэт пачаў адлік сваёй гісторыі ў складзе двух асноўных і аднаго дапаможнага факультэтаў. Умовы яго працы былі надзвычай цяжкія: недахоп элементарнага абсталявання, кніг (так, гістарычная бібліятэка размесцілася на паўтары кніжных паліцах), голад, не сціхаўшы накал класавай барацьбы і г. д. Аднак, нягледзячы на тое, што заняткі адбываліся толькі ў вечаровы час, паколькі шмат студэнтаў удзень працавала, аўдыторыі заўсёды былі перапоўненымі, так што большасць вымушана была слухаць лекцыі стоячы.

Увасабленне ідэі беларускага універсітэта патрабавала дакладнага матэрыяльнага забеспячэння. Урад ССРБ, гарвыканком Менска здолелі, карыстаючыся чыста рэвалюцыйнымі метадамі (напрыклад, метадам канфіскацыі), перадаць універсітэту шэраг будынкаў, лабараторнага абсталявання, кніг. З цяжкасцямі, але знаходзілі і грошы для аплаты працы супрацоўнікаў, на стыпендыі студэнтаў, на рамонт, на бытавыя патрэбы і інш. Але ўжо праз год існавання універсітэта, калі адбыўся другі прыём студэнтаў, рэзка пагоршыліся ўмовы для вядзення навучальнага працэсу. Будынкі, якія былі БДУ перададзены летам 1921 г. для гэтых мэт (былыя епархіяльнае вучылішча, рэальнае вучылішча Хайкіна, гімназія Фальковіча, фабрыка «Вікторыя» і інш.) ужо не маглі ўмясціць ні студэнтаў, ні выкладчыкаў, ні адміністрацыю. Падчас прыходзілася адмяняць заняткі, бо з-за вялікага скаплення студэнтаў у аўдыторыях (напрыклад, у «Доме № 3 БДУ» — былое вучылішча Хайкіна, дзе размясціліся ФГН і педфак, адначасова сабіралася каля 1,5 тыс. студэнтаў), як адзначалася, «профессора изнемогают в буквальном смысле этого



слова» [12, арк. 35]. З-за гэтага было правілам прымаць залікі прама на прафесарскіх кватэрах, хаця Праўленне універсітэта ўсяляк гэтаму спрабавала перашкодзіць.

Універсітэт амаль з першых дзён існавання ўзяў курс на фінансавае самазабеспячэнне праз платную форму навучання. Студэнты-платнікі аплачвалі сваю вучобу не толькі тагачаснымі мільёнамі рублёў, але і натурай (напрыклад, пастаўлялі дровы для ацяплення жылля супрацоўнікаў БДУ) [8, арк. 43]. Цікава, што Праўленне вызначыла плату за навучанне як збор «на оборудование университета» [11, арк. 67]. Справа ў тым, што плату за навучанне яно было вымушана ўвесці сваім рашэннем ад 8 сакавіка 1922 г., так як адсутнасць сродкаў ставіла пытанне аб зачыненні БДУ. Так, рэктар адзначыў, што з Масквы двойчы настойліва рэкамендавалі гэта

зрабіць. Вось чаму трэба аддаць належнае мясцовым уладам, якія змаглі знайсці хоць мінімальныя сродкі, каб падтрымаць, зберагчы БДУ у гэтыя першыя, самыя цяжкія часіны.

Акрамя таго, практыкавалася так званая «самообложение» студэнтаў, калі з кожнага ўзымалася пэўная сума грошай на карысць універсітэта [9, арк. 3]. Ішлі грошы і ад продажу студэнтам праграм універсітэцкіх курсаў і іншых вучэбных выданняў. Немалую матэрыяльную падтрымку меў БДУ ад благачынных дзеянняў: нават 50 харчовых пасылак, атрыманых ад АРА вясной 1922 г., дазволілі студэнтам хоць неяк падмацаваць свой рацыён [11, арк. 21]. За кошт амерыканскай дабрачыннасці ў 1923 г. былі адкрыты для студэнтаў сталовыя (напрыклад, на былой вул. Багадзельнай, цяпер Камсамольская, дзе знаходзіліся вучэбныя будынкі БДУ [19; 20; 25]. Крыху пазней, у 1925 г., універсітэцкія медыкі атрымалі ад арганізацыі «Джойнт» 5 тыс. долараў для клінікі нервовых хвароб, калекцыю табліц і інш. За гэту дапамогу праўленне БДУ выказала падзяку дырэктару амерыканскай арганізацыі «Джойнт» пану Брамсону [17, арк. 8; 10; арк. 111].

Менскі гарвыканком з 6 мая 1922 г. узяў на сябе ўсе выдаткі БДУ за ваду і электрычнасць. Акрамя таго, у пачатку 1923 г. гарадскія ўлады выдзелілі БДУ 10 млрд рублёў на пакрыццё камунальных паслуг [9, арк. 4]. Такім чынам, стала складвацца нейкая сістэма фінансавага забеспячэння дзейнасці БДУ, тады як з 1921 г., па словах У. І. Пічэты, «…існаванне універсіэта падтрымлівалася выпадковымі асігнаваннямі». Так, лабараторыі і кабінеты медфака абсталёўваліся за кошт то прэзідыума ЦВК, то наркамздрава, то АРА [9, арк. 19]. Напрыклад, па хадайніцтву Праўлення БДУ прэзідыум ЦВК у лістападзе 1922 г. выдзеліў на універсітэцкія патрэбы 7 млн рублёў, хаця запрашвалася ўдвоя больш [8, арк. 56].

Толькі праз некалькі гадоў БДУ стаў атрымліваць неабходныя сродкі для свайго існавання, а галоўнае — для развіцця, перспектыў. У 1924/25 навучальным годзе з’явіўся сталы бюджэт [36, с. 21].

Пры гэтай напружанай арганізацыйнай рабоце У. І. Пічэта працягваў сваю навуковую дзейнасць: каля 150 прац і даследаванняў па гісторыі Беларусі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Баварыі, Літвы, па гістарыяграфіі, археалогіі, архівазнаўстве, краязнаўстве, гісторыі права Беларусі пабачылі свет падчас беларускага перыяду яго дзейнасці.

1926 г. быў трыумфальным у жыцці Уладзіміра Іванавіча на Беларусі. Беларускі універсітэт адзначыў сваё пяцігоддзе. 31 кастрычніка БДУ свят-



каваў не толькі свой першы юбілей, але і 25-годдзе навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасці У. І. Пічэты. Гэтым падзеям былі прысвечаны старонкі цэнтральных газет. Вялікай плынню ішлі да яго віншаванні ад студэнтаў і навуковых працаўнікоў, ад арганізацый і асобных грамадзян, ад урадавых устаноў і яго ўласных аспірантаў, ад прафесараў і настаўнікаў, ад вайскоўцаў і ад секцый прафсаюзаў, ад Інстытута беларускай культуры (сёння НАН Беларусі) і Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі (сёння Нацыянальная бібліятэка)... Усё гэта сведчыла не толькі аб безумоўным аўтарытэце У. І. Пічэты, але і аб тым, што БДУ адбыўся, што цяпер яны робяцца неразрыўны — універсітэт і першы яго рэктар.

Адзначаючы арганізатарскую і кіраўнічую працу У. І. Пічэты на пасадзе рэктара БДУ, «існаваньне якога неразрыўна зьвязана з Вашым імем, як першага яго Рэктара», яго навуковую дзейнасць, якая «зьяўляюцца моцным грунтам для далейшага вывучэньня Беларускай краіны нашымі маладымі навуковымі сіламі», урад Беларусі надаў Уладзіміру Іванавічу Пічэце ганаровае званне заслужанага прафесара Беларусі [2]. Гэтакім званнем ні да яго, ні пасля не быў ушанаваны ніводны навукоўца.

Універсітэт пры У. І. Пічэце рабіўся сапраўды беларускім: у І927 г. у сярэднім каля 50 % вучэбных гадзін чыталіся па-беларуску. І гэта пры тым, што мовамі навучання, акрамя беларускай, былі яўрэйская, польская і руская; існавалі польскае і яўрэйскае аддзяленні.

Стварыўшы універсітэт літаральна на пустым месцы, Уладзімір Іванавіч пакідаў яго ў складзе 4-х факультэтаў [без рабочага]: медыцынскага, права і гаспадаркі, хіміка-тэхналагічнага педагагічнага з аддзяленнямі прыродазнаўчым, сацыяльна-гістарычным, літаратурна-лінгвістычным, фізіка-матэматычным, на якіх працавалі 51 прафесар, 53 дацэнты, 84 асістэнты, 88 выкладчыкаў, 24 ардынатары, 6 лабарантаў і вучылася больш за 2600 студэнтаў.

У спадчыне У. І. Пічэты таксама і пачатак увасаблення ідэі асобнага універсітэцкага гарадка. Неабходнасць яго будаўніцтва як комплекса адзінага па сваёй архітэктуры і месцазнаходжанні, была зразумелай і Праўленню БДУ на чале з рэктарам, і савецка-партыйнаму кіраўніцтву Беларусі. Рэалізацыя ж ідэі патрабавала велізарных для таго часу і таго становішча эканомікі грошай. Таму некалькі гадоў універсітэт пашыраў свае плошчы як за кошт усё новых будынкаў, якія яму перадавалі ўлады (зразумела, спачатку іх у кагосці забіралі), так і шляхам будаўніцтва адмыслова для патрэбаў БДУ. Так, у 1926 г. СНК даў згоду на ўзвядзенне карпусоў менавіта для універсітэта [26].

І толькі напачатку 1927 г. пытанне аб неабходнасці будаўніцтва універсітэцкага гарадка было ўладамі вырашана станоўча: у лютым III сесія ЦВК БССР прыняла па дакладу ўрада спецыяльную пастанову аб будаўніцтве [32, с. 34]. Будаўніцтва такіх маштабаў, бадай, было адным з першых за гады існавання савецкай Беларусі. 6 лістапада 1927 г. адбылася закладка першай цагліны ў падмурак універсітэцкага гарадка. У святочнай атмасферы перад сабраўшыміся студэнтамі і гараджанамі выступілі нарком асветы БССР А. В. Баліцкі, рэктар У. І. Пічэта, а таксама савецка-партыйныя кіраўнікі Беларусі М. М. Галадзед і В. Г. Кнорын, якія правялі паралелі паміж сутнасцю універсітэта і задачамі і сэнсам савецкай улады [21]. Праз год, аглядаючы панараму будаўніцтва, аб гэтым жа з задавальненнем гаварыў і нарком асве-



ты СССР А. В. Луначарскі, які спецыяльна прыехаў у Менск і прыняў удзел у пасяджэнні Праўлення БДУ 23 лістапада 1928 г., на якім слухалі даклад архітэктара Г. Лаўрова аб ходзе будаўніцтва гарадка [14, арк. 32].

Складанасць становішча Беларускага універсітэта ў першыя гады яго існавання не ідуць ні ў якае параўнанне з тымі перашкодамі, якія яму давялося пераадолець у перыяд росквіту таталітарнага сталінскага рэжыму. Знешне ўсё было нібы прыстойна і паспяхова. У 1930—1931 гг. на базе БДУ былі створаны як самастойныя медыцынскі, політэхнічны, народнай гаспадаркі, педагагічны, юрыдычны інстытуты. Увесь час узрастаў і творчы патэнцыял вучоных. Асабліва вялікія і плённыя даследаванні былі праведзены гісторыкамі на чале з рэктарам У. І. Пічэтам. Яны, па-сутнасці, вярнулі беларускаму народу яго гістарычную памяць, апублікаваўшы зборнікі дакументаў, манаграфіі і падручнікі па беларускай гісторыі. Менавіта ў тыя гады адбылося складванне мадэлі гісторыі Беларусі, якая (з пэўнымі зменамі) існуе і сёння.

Ці не таму менавіта універсітэцкія гісторыкі, як і гісторыкі Беларускай акадэміі навук (а тады шмат хто з іх працаваў адначасова ў двух гэтых установах), зрабіліся аднымі з першых ахвяр рэпрэсіўнай сталінскай машыны. Ва ўсіх адносінах паказальны ў гэтай сувязі лёс У. І. Пічэты.

Уладзімір Іванавіч хаця і не быў беларусам, але зрабіў усё магчымае, каб менавіта беларуская ідэя зрабілася падмуркам у стварэнні сістэмы адукацыі ў Беларускім універсітэце. І паўсюль, нават беручы ўдзел у вядомых Рыжскіх перамовах 1921 г., ён «оборонял белорусское культурное существование» [18, арк. 38]. Яго зацікаўленасць і павага да беларускай гісторыі былі не палітычнай кан'юнктурай, не сродкам да выжывання ва ўмовах рэвалюцыйных узрушэнняў. Гэта была навукова абгрунтаваная пазіцыя вучонага, якая, аднак, ужо з 1921 г. не заўсёды станоўча ўспрымалася тагачасным палітычным кіраўніцтвам. Яго навуковая інтуіцыя падказвала, якім шляхам раней ці пазней, але бясспрэчна пойдзе беларускі народ у паслярэвалюцыйны час. І ў гэтай сувязі немалую ролю павінна была адыграць аб'ектыўная гістарычная навука.

На працягу ўсёй сваёй працы ў БДУ У. І. Пічэта збіраў у адзінае цэлае беларускую гістарычную спадчыну, накіроўваў вучоных і студэнтаў на распрацоўку беларускай тэматыкі. Сам жа ён, нягледзячы на каласальныя адміністрацыйныя нагрузкі, напружана працаваў як вучоны. За 9 гадоў працы ў БДУ рэктар-гісторык штогод публікаваў да 25 кніг, артыкулаў, дакладаў [43, с. 4].

Ва універсітэце ён меў непераканаўчы аўтарытэт. У шмат чым дзякуючы яго энергіі, бясспрэчным арганізатарскім здольнасцям, высокаму навуковаму і педагагічнаму майстэрству і здолеў адбыцца Беларускі універсітэт, былі пераадолены надзвычай цяжкія абставіны першых гадоў існавання: спустошанасць, адсутнасць элементарных умоваў працы, першапачаткова нізкі ўзровень першых студэнтаў, недахоп кадраў выкладчыкаў.

Характэрна, што шматлікія вядомыя навукоўцы Расіі ехалі ў Менск на працу ва універсітэт толькі таму, што іх асабіста запрашаў рэктар, таму што адмовіць гэткаму чалавеку было проста нельга. Ён уражваў калегаў і студэнтаў сваёй дабрынёй, інтэлегентнасцю, спагадлівасцю, памножанымі на кампетэнтнасць і прынцыповасць. У анкеце, адказваючы на пытанне, якая рыса ў чалавека болей за ўсё яму імпануе і што галоўнае ў падрыхтоўцы студэнтаў, Уладзімір Іванавіч лаканічна адказаў: «прафесіяналізм».



Сам ён быў прафесіяналам высокага класа, які бескампрамісна абараняў свае погляды і перакананні. Ён не сумняваўся ў тым, што беларускія гісторыкі павінны скіраваць свае намаганні на»создание истории белорусского народа, отказавшись от взглядов на историю Белоруссии как на часть истории Москвы, Польши или Литвы», і што навукова абгрунтавана існаванне здаўна «белорусско-литовского государства» і «белорусского народа» [22; 23]. Доказы сваім сцверджанням ён знаходзіў у архівах, у тым ліку і замежных (Літвы, Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі, Нарвегіі і інш.), якія, нягледзячы на вялікую занятасць, рэгулярна наведваў на працягу 1920-х гг. Ён садзейнічаў усталяванню навуковых сувязей з вучонымі Кёльна, Варшавы,

Прагі, Осла і іншых еўрапейскіх цэнтраў. Не мог быць у баку вучоны рэктар і ад праблем марксізма як навуковай плыні, паколькі ён не толькі ахапіў грамадства, але і зрабіўся дзяржаўнай ідэалогіяй. Аднак рэалізацыя гэткай цікаўнасці не ішла далей мітынговых выступленняў, у якіх У. І. Пічэта вымушаны быў удзельнічаць з прычыны ўнікальнасці займаемай пасады: з самых першых дзён універсітэт, яго супрацоўнікі і, вядома ж, у першую чаргу рэктар, успрымаліся партыйна-дзяржаўнымі структурамі і кіраўнікамі не як праваднікі адукацыі, навукі, культуры, а як абаронцы і інтэрпрэтатары афіцыйнай ідэалогіі, яе «расаднікі». Аднак ён ніколі не прынізіўся да выкрыцця ці «вялікадзяржаўнага шавінізму», ці «буржуазнага нацыяналізму», не зрабіўся аўтарам нізкаякасных манаграфій накшталт «Идеология загнивающего капитализма».

На гэткую някемлівасць рэктара ўлады немінуча павінны былі адрэагаваць. Гэта адбылося ў 1929 г., калі ганенні на прадстаўнікоў «старой» (г. зн. дарэвалюцыйнай) інтэлігенцыі дасягнулі свайго апагею. Сталінскі рэжым мог сабе дазволіць у чарговы раз перабраць кадры, каб «адсеяць» непажаданых і прымусіць да беспярэчнага падпарадкавання сумняваючыхся. Гэтая «логіка» ўладаў адбілася і на лёсе першага рэктара Беларускага універсітэта, і ўсяго яго калектыву. У. І. Пічэта спачатку не быў пераабраны на сваю пасаду. А праз год арыштаваны па абвінавачванні ў дзейнасці па «быстрейшему осуществлению планов интервенции против СССР» і як «белорусский буржуазный националист и великодержавный шовинист».

Ён праходзіў па так званай «справе Платонава» Ї вядомага расійскага гісторыка, ілжыва пастаўленага ўладамі і заўзятым следствам на чале больш за 100 вядомых савецкіх дзеячаў навукі і культуры як «преступной антисоветской организации». Гады турмы і ссылкі былі для У. І. Пічэты не самым горшым вынікам абвінавачвання... Сёння следчая справа першага беларускага рэктара знаходзіцца ў архівах расійскіх спецслужбаў [3].

Ордэрам за № 2 ад 13 верасня 1930 г. у доме № 103 па вуліцы Савецкай у Менску супрацоўнік паўнамоцнага прадстаўніцтва Аб'яднанага Дзяржаўнага Палітычнага Упраўлення пры СНК СССР па Белваенакрузе нейкі «таварыш» Сікорскі Міхаіл правёў вобыск на кватэры прафесара БДУ, яго нядаўняга, першага рэктара, Уладзіміра Іванавіча Пічэты. І як вынік — у лёсе гісторыка месяцы страшэнных пакут, здзекаў, перaацэнкі ўсяго ранейшага жыцця і ранейшых матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Як потым, у чэрвені 1932 г. у вяцкай высылцы, запіша разбіты маральна і фізічна выдатны вучоны, педагог, арганізатар вышэйшай школы Беларусі — гэта быў час «величайшего уныния и упадка духа», «крайне подавленного состояния», калі



ён за сваё «старо-интеллигентское отношение» да класавых ворагаў пралетарыята сурова быў пакараны [3, арк. 174].

Адной з груповак «класавых ворагаў» змардаваны прафесар вымушаны быў назваць сваіх польскіх калег, навукоўцаў, архівістаў, з якімі яму прыйшлося шчыльна кантактаваць у канцы 1920 г. у Рызе, а потым у 1922—1924 гг. у Петраградзе і Варшаве, займаючыся экспертызай артыкулаў Рыжскай дамовы.

Аб удзеле У. І. Пічэты ў Рыжскіх перамовах вядома даўно. Тым не менш падрабязнасці аб яго ролі ў гэтых падзеях не былі даступны нават даследчыкам, спецыяльна займаўшыхся біяграфіяй, навуковай і грамадскай дзейнасцю знакамітага гісторыка, першага рэктара БДУ. Хаця артыкулаў аб яго дзейнасці існуе вялікая колькасць толькі ў беларускай гістарыяграфіі [42, с. 1—7].

Вось чаму надзвычай цікавымі аказаліся лісткі асабістай справы, якая была заведзена на Уладзіміра Іванавіча органамі АДПУ у рамках расследавання дзейнасці групы вядомых гісторыкаў, якіх абвінавацілі ва ўдзеле ў антысавецкай арганізацыі на чале з прафесарам Сяргеем Фёдаравічам Платонавым. Гэта справа зараз знаходзіцца ў архіве УФСБ Расіі па Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобласці і складаецца з амаль дваццаці таўшчэзных тамоў. Некаторыя матэрыялы ў 90-я гг. былі надрукаваны ў трохтомніку пад назвай «Академическое дело. 1929—1931 гг.»

Але асноўная частка матэрыялаў пакуль што даступная толькі для тых, хто працуе ў згаданым архіве, хаця 263 старонкі рукапіснага і друкаванага тэксту ў 1999 г. удалося нарэшце вярнуць на Беларусь, праўда ў капіравальным выглядзе. Яны датычацца розных бакоў жыццёвага, педагагічнага і навуковага шляху Уладзіміра Іванавіча. Хацелася б згадаць гэты найцікавы матэрыял у поўным аб'ёме, даць услед за Пічэтай і ягонымі словамі характарыстыку беларускага нацыянальнага руху, яго актыўных дзеячаў, характарыстыку знакамітых гісторыкаў М. К. Любаўскага, М. В. Доўнар-Запольскага, С. Ф. Платонава, А. А. Кізіветтара, М. М. Багаслоўскага, С. У. Бахрушына і інш. Прывесці найцікавейшыя дэталі абставін першага дзесяцігоддзя існавання БДУ. Але гэта ў іншым месце і ў іншы час.

Звяртаючыся да прадмета даследавання, неабходна прадставіць некалькі найбольш яркіх старонак з азначанай справы. І рукой самаго Пічэты, і рукой яго «візаві», нейкага следчага Жупахіна, дастаткова падрабязна распавядаецца аб удзеле рэктара ў Рыжскіх перамовах і камісіі, якая займалася разглядам пытанняў аб перадачы культурных каштоўнасцей. Гэтую камісію

ўзначальваў Пётр Лазаравіч Войкаў, які з кастрычніка 1924 г. па чэрвень 1927 г. быў паўпрэдам СССР у Польшчы.

Цікава, што калі следчы абазначыў гэтую камісію як «Рыжскую», то Пічэта сваёй рукой выправіў назву, закрэсліўшы першыя чатыры літары і замест іх упісаў новыя пяць, так што камісія стала «Польскай». Гэты штрых увасобіў і дакладнасць вучонага, і асноўны сэнс, які Пічэта ўкладваў у вызначэнне сваёй ролі ў гэтай камісіі. Ён, як член Цэнтрархіва (пэўны час рэктар БДУ сумяшчаў гэтую працу, на якую ён уладкаваўся ў Маскве ў паслярэвалюцыйны перыяд, з новай пасадай у Мінску) і знаўца гістарычнай падаплёкі тых культурных каштоўнасцей, вакол якіх асабліва горача ішлі спрэчкі наконт іх прыналежнасці ці то Польшчы, ці то Расіі, Украіне, Беларусі, асабіста жор-



стка адстойваў інтарэсы савецкага боку. Праблема была, галоўным чынам, у дакументах, якія збіраліся перадаць польскаму боку. І як сведчаць шматлікія акцэнты, растаўленыя на допытах разгубленым і расцёртым умовамі засценкаў, у якіх раптам апынуўся інтэлегент-прафесар, Пічэта «прымаў заўсёды актыўны ўдзел і вусна, і пісьмова ва ўсіх антыпольскіх выступленнях». Так, ён вызначыў сваю ролю ў асобна напісаным «Общественно-политическом кредо», якое вымушаны быў скласці, калі ўсе спробы даказаць сваю невіноўнасць правальваліся пад жорсткімі і беспадстаўнымі абвінавачваннямі следчых [3, арк. 261].

Са справы добра бачна, што «польская састаўляючая» у абвінавачваннях Пічэты была адной з галоўных. Яму прыпісваўся і шпіянаж на карысць Польшчы, і прапольскія дзеянні на пасадзе рэктара, і прапольскія творчыя (як гісторыка) высновы ў навуковых працах. Гэта тады, напачатку 1930-х гг., было звыклым аргументам карных дзеянняў у адносінах да найбольш выдатных прадстаўнікоў інтэлігенцыі, асабліва беларускай. Усім прыходзілася знаходзіць апраўданне літаральна кожнаму свайму кроку, які тым ці іншым чынам меў дачыненне да Польшчы.

А Уладзіміру Іванавічу, што толькі не прыпісвалі ў гэтым сэнсе! І тое, што ў 20-я гг., падчас працы ў БДУ ён як прафесар-гісторык амаль цалкам быў захоплены тэмай беларускай гісторыі, а гэта значыць і гісторыяй польска-беларускіх стасункаў. Ён не раз быў у навуковых камандзіроўках у Польшчы, меў дзесяткі сустрэч з дзеячамі польскай культуры і навукі. Так, у 1923 г. ён амаль 1,5 месяца займаўся ў Варшаве і Берліне вывучэннем крыніц па розных накірунках беларускай гісторыі. Прывёз з Варшавы грунтоўную працу «Современная польская историография Беларуси» [24]. У 1927 г. падчас камандзіроўкі аказаўся ледзь не сведкам забойства П. Л. Войкава, бо за некалькі гадзін да гэтага меў з ім доўгую гутарку. Ужо тады рэктару прыйшлося пісаць стосы папер па дадзенаму факту. Зразумела, для адпаведных органаў.

Вось чаму не дзіўна, што як бы прадбачачы абвінавачванні, У. І. Пічэта спрабаваў у афіцыйных выступленнях, у службовых паперах штораз падкрэсліваць сваю лаяльнасць да савецкай улады і негатыўныя адносіны да яе знешнепалітычных апанентаў. Не дзіўна, што нават у звычайнай аўтабіяграфіі для аддзела кадраў універсітэта сярод асноўных звестак аб сабе рэктар падкрэсліў той факт, што ён у 1920 г. удзельнічаў у якасці эксперта ў Рыжскіх перамовах, бо займаў пасаду галоўнага інспектара і загадчыка навукова-тэарэтычнага аддзела Цэнтрархіва (з 1918 па 1922 г.). А на працягу 1922—1924 гг. быў экспертам пры «Расійска-ўкраінскай знешняй камісіі па рэалізацыі Рыжскага мірнага дагавора» [9, арк. 4].

Як можна меркаваць, тады рэктар інтуітыўна прадбачыў здзекі і абвінавачванні 1930 г. і стараўся вызначыць найбольш выйгрышны факт сваёй дзейнасці не пра, а супрацьпольскага характару.

Таму 5 старонак яго сведчанняў аб працы ў якасці эксперта, пазначаныя ў справе пад назвай «Польская (Рыжская) камісія» утрымліваюць шмат эмоцый, перабольшванняў [3, арк. 151—153]. Ён распавядае аб прадгісторыі стварэння камісіі камісарыята замежных спраў. Што польскі бок нейкі час спрабаваў забраць з архіваў Расіі і Украіны ўсе тыя дакументы, якія лічыў неабходнымі. Што камісія пад кіраўніцтвам Праснякова ў «Петербурге» патака-



ла патрабаванням палякаў і што менавіта ён, Пічэта, забараніў бескантрольны разбор дакументаў спецыяльнай польскай камісіяй, хаця пэўная колькасць архіўных матэрыялаў без рэгістрацыі апынулася за мяжой, у Варшаве. Аб гэтым сам Пічэта даведаўся ад польскіх гісторыкаў у час знаходжання ў Познані на Кангрэсе польскіх гісторыкаў (кастрычнік 1925 г).

У 1923 г. Пічэта, ужо спыніўшы работу ў Цэнтрархіве, як рэктар БДУ працягваў работу ў камісіі Войкава. Разам з ім працаваў і М. К. Любаўскі. Як адзначае Уладзімір Іванавіч, іх праца была канфліктнай, камісія выказвалася рэзка адмоўна наконт выдачы многіх дакументаў палякам. І ён асабіста «сражался с поляками на фронте Литовской Метрики», так як менавіта ўрад савецкай Беларусі даручыў яму, рэктару-гісторыку, зрабіць усё, каб толькі захаваць Метрыку. Спрэчкі вяліся

і вакол бібліятэкі графа Залуцкага і ўсёй Публічнай бібліятэкі, вывезенай з Варшавы ў 1793 г. У рэшце рэшт, як вынікае з расказу Пічэты, большасць патрабаванняў польскіх экспертаў была задаволена «в силу дипломатических переговоров» [3, арк. 152].

Праз час, у 1932 і 1933 гг., знаходзячыся ў высылцы ў Вятку, У. І. Пічэта зноў акцэнтаваў увагу улад на сваіх дзеяннях падчас экспертнай работы. Вымальваючы літасці ён прыгадвае ў зваротах у калегію АДПУ і працу ў Рызе, і ўдзел у камісіі Войкава, і апрацоўку польскіх прафесараў на прадмет іх адносін да СССР у час камандзіровак у Польшчу [3, арк. 175].

У далейшым лёс У. І. Пічэты цудоўным чынам зрабіў новы паварот. Яго, у адрозненне ад большасці калег па «акадэмічнай справе», вярнулі ў Маскву, аднавілася яго навуковая і выкладчыцкая праца, праўда, ужо па-за межамі Беларусі. Але ён не пакінуў, а наадварот, працягнуў свае даследаванні па славянскай, у тым ліку і польскай праблематыцы. Усё ж час, праведзены за кратамі, наклаў свой адбітак. Былая грамадская, арганізатарская актыўнасць, апантанасць у рэалізацыі сваіх ідэй зніклі. І не раз, як сведчаць дакументы [39], нядобразычліўцы спрабавалі ў канцы 30-х гг., асабліва ў 1939 г., нашаптаць у адпаведныя інстанцыі аб пічэтаўскай зацікаўленасці ў стасунках з польскімі калегамі, у праблемах польскай гісторыі і г. д.

На Беларусь У. І. Пічэта больш ужо не здолеў вярнуцца. Але безумоўна тое, што менавіта «беларускі перыяд» яго жыцця быў лёсавызначальным ва ўсіх адносінах. Ці разумеў гэта сам Уладзімір Іванавіч? Бадай, што так. Знаходзячыся апошнія месяцы на пасадзе рэктара БДУ і адбіваючыся ад зграі розных «Соседов», «Секретов», «Дальнозорких» і іншых вядомых і невядомых «добразычліўцаў» рэжыма, У. І. Пічэта выступіў з заявай: «...Я вельмі ганаруся тым, што савецкі ўрад даручыў мне ганаровую, але вельмі цяжкую працу па арганізацыі універсітэта для працоўных мас Беларусі...» [2]. Гэтыя словы Уладзіміра Іванавіча Пічэты, гісторыка і гуманіста, вельмі трапна характарызуюць яго ролю ў гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, адукацыі і навукі ўсёй Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Архив БГУ. Описи дел Белгосуниверситета за период 1921—1932 годов.
2. Архіў Музея гісторыі БДУ.
3. Архіў УФСБ РФ па Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобласці. Спр. № П-65245. (у 19 т.). Т. 19.



4. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1.
5. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 2.
6. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 6.
7. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1 Спр. 8.
8. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 10.
9. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 12.
10. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 21.
11. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 38.
12. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 49.
13. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 113.
14. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 334.
15. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 751.
16. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 940.
17. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 995.
18. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 6335.
19. Звезда. 1923. 9 янв.
20. Звезда. 1923. 8 февр.
21. Рабочий. 1927. 10 ноября.
22. Савецкая Беларусь. 1922. 17 кастр.
23. Савецкая Беларусь. 1923. 14 сак.
24. Савецкая Беларусь, 1923, 14 вер.
25. Савецкая Беларусь. 1923. 1 ліст.
26. Савецкая Беларусь. 1926. 27 чэрв.
27. Белорусский государственный университет за 1921—1922 акад. год. Мн., 1922.
28. *Вальфсон С. Я.* Адрыўкі ўспамінаў і думкі // Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921—1927. Мн., 1927.
29. Вестник Народного Комиссариата просвещения ССРБ. Октябрь 1921. № 1.
30. *Иоффе Э. Г.* Страницы жизни академика В. И. Пичеты // Академик В. И. Пичета. Страницы жизни. Мн, 1981.
31. *Карасев В. Г.* И. Х. Пичета (1844—1920) // Славяне в эпоху феодализма. К 100-летию академика В. И. Пичеты. М., 1978.
32. *Кожушков А. И., Яновский О. А.* Белорусский университет: хроника событий (1919—1989). Мн., 1990.
33. *Королюк В. Д.* Владимир Иванович Пичета (опыт творческого портрета) // Вопр. истории. 1970. № 8.
34. *Королюк В. Д.* Владимир Иванович Пичета // Славяне в эпоху феодализма. К столетию академика В. И. Пичеты. М., 1978.

35. Першы выпуск Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 20 лютага 1925 году. Віцебск, 1925.
36. *Пічэта У. І.* Беларускі дзяржаўны універсітэт напярэдадні 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі // Беларускі дзяржаўны універсітэт. Да 10-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Менск, 1927.
37. *Пичета В. И.* Мое общественно-политическое кредо // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 4.
38. *Руколь Б. М.* В. И. Пичета — педагог и пропагандист идеи общности исторического развития славян // Историческая славистика в МГУ. 1989—1999 гг. Сб. ст. М., 2000.
39. *Селяменеў В., Бараноўскі Я.* Піянер вышэйшай школы // Звязда. 1997. 5 ліст.
40. *Сушкевич Л. П.* История южных и западных славян // Академик В. И. Пичета. Страницы жизни. Мн, 1981.
41. Труды Белорусского государственного университета в Минске. 1922. № 1.
42. Уладзімір Іванавіч Пічэта (1878—1997). Бібліяграфічны спіс літаратуры. Мн.: БДУ, 1998. С. 1—7.
43. *Яноўскі А.* Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 3.